# За дастойную сустрэчу веснавой сяўбы

* * *

## Канчаюць засыпку насення

Члены сельгасарцелі „Чырвоны Металіст“, Краўцоўскага сельсовета (Суражскі раён), рыхтуюцца дастойна сустрэць першую веснавую сяўбу на вызваленай ад нямецкіх акупантаў зямлі.

Ў адказ на загад правадыра таварыша Сталіна ад 23 лютага калгаснікі на сваім агульным сходзе рашылі забяспечыць насенным матэрыялам увесь пасеўны клін ваеннага часу.

Дэпутат сельскага совета член праўлення калгаса Зверава Елена Данілаўна гаворыць:—прыкладзем усе намаганні, каб ні адзін кавалак калгаснай зямлі не застаўся незасеяным.

Яна першай засыпала ў засекі агульнага свірна 16 пудоў адборнага насеннага зярна.

Прыкладу гарачай любві да совецкай радзімы тав. Зверавай паследвалі другія калгаснікі. Так, калгасны рахункавод комсамолка Юрчанка Александра Фядосаўна ўнесла ў насенны фонд 8 пудоў зернавых, а калгасны конюх Асабенка Еўдакія Леонаўна здала ў насенны фонд 15 пудоў добраякаснага пасеўнага матэрыялу.

Зараз у калгасе ўжо набліжаецца да канца засыпка насеннага зярна, а таксама захоўваецца патрэбная колькасць пасадачнай бульбы.

Вялікую ўвагу калгаснікі ўдзяляюць падрыхтоўцы да вясны сельгасінвентара, які па-гаспадарску падобран і рамантуецца. Утвараецца рамонт і падгонка рабочай збруі.

Каб атрымаць у гэтым годзе высокі ўраджай, у калгасе прыступілі да збору мясцовых угнаенняў. Сіламі комсамольцаў і моладзі калгаса ўжо сабрана да дзесятка цэнтнераў попелу.

М. АЛЕКСАНДРАЎ.

## ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ



НА ЗДЫМКУ: У Палехскай кантрольна-насеннай лабараторыі (Іванаўская вобласць). Загадчыца лабараторыяй А.Д.Маркава (справа) і аграном лабараторыі Г. І. Бархатава—за праверкай на чыстату насення, прывезенага з калгаса „Верны шлях“.

## У вызваленай МТС

Гітлераўскія пагромшчыкі канчаткова разбурылі Суражскую МТС. Знішчылі ўсе пабудовы, увесь трактарны парк і сельскагаспадарчыя машыны.

Але, як толькі Чырвоная Армія вызваліла наш раён ад нямецкіх акупантаў, на мясцах папялішчаў і развалін зноў разгарнулася аднаўленчая работа.

На дапамогу нам прышлі совецкі ўрад і партыя, паслаўшая для работы ў МТС нашай вобласці многа трактароў і прычэпнага інвентара, а разам з тэхнікай--трактарыстаў, брыгадзіраў трактарных брыгад і механікаў.

Мы высока цэнім аказваемую нам дапамогу і прымаем усе меры да таго, каб стварыць добрыя бытавыя ўмовы для прыязджаючых да нас з тылавых совецкіх раёнаў механізатарскіх кадраў і забяспечыць бесперабойную работу трактароў на веснавой сяўбе.

Уласнымі сіламі мы абсталявалі добрую кузніцу. У ёй зараз з поспехам праводзім рамонт сельскагаспадарчых машын і інвентара.

Для работы газагенератараў ужо загатовілі патрэбную колькасць чурак, якія захоўваюцца ў сухім памяшканні. Адрамантавалі многа тары для захоўвання гаручага—жалезныя бочкі і цыстэрны—і абсталявалі нафтабазу. Рухтуем свае механізатарскія кадры.

Усё гэта вельмі важныя дэталі падрыхтоўкі да вясны, без якіх было-б немагчыма паспяховае правядзенне вясенне-палявых работ.

Т. МАГУЧЫ.

## У кантрольна-насенных лабараторыях

У Лёзненскім раёне абсталявана і прыступіла да работы кантрольна-насенная лабараторыя.

Першыя вынікі праверкі паказалі, што пасеўныя матэрыялы адпавядаюць усім патрабаванням устаноўленых кандыцый. Усхожасць ад 80 да 100 проц.

Добрыя вынікі ўсхожасці пасеўнага матэрыялу выяўлены Суражскай кантрольна-насеннай лабараторыяй. Тут таксама ўсхожасць насення ў межах 80—93 процанты.

## Завоз тавараў для калгаснікаў

У мінулым месяцы для насельніцтва вызваленага горада Лёзна і насялёных пунктаў раёна завезена розных тавараў на 169337 рублёў. У ліку іх—больш 5 тон солі, мыла, промтавары.



Знатны машыніст паравознага дэпо Рассош, Паўднёва-Ўсходняй чыгункі ордэнаносец комуніст А. В. Дзегцяроў у час работы ў прыфрантавай паласе, рыскуючы жыццём, умелымі манёўрамі выратаваў ад бамбёжкі фашысцкай авіяцыі таварны і пасажырскі паязды. Пасля выгнання немцаў з Рассошы, тав. Дзегцяроў зноў вярнуўся ў роднае дэпо, дзе быў вылучан на пасаду машыніста-інструктара і нястомна працуе над аднаўленнем транспарта.

# ДАВЕДАЧНАЯ ТАБЛІЦА

## 34 тыража выйгрышаў Дзяржаўнай Унутранай Выйгрышнай Пазыкі 1938 года

### Тыраж адбыўся 30 студзеня 1944 года ў гор. Маскве

Супадзенне нумара серыі, які знаходзіцца на аблігацыі, з нумарам серыі, апублікаваным у гэтай табліцы, азначае, што даная аблігацыя выйграла. Такую аблігацыю трэба прад'явіць у ашчадную касу для атрымання выйгрыша.

Выйгрышы выпалі на ўсе 40 нумароў аблігацыя [з нумара 01 па № 40] наступных серый:

| №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый | №№ серый |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 00263 | 10047 | 16944 | 25412 | 32124 | 40768 | 48102 | 57415 | 64503 | 69141 |
| 00950 | 10082 | 17185 | 25880 | 33354 | 41548 | 48963 | 58015 | 65473 | 69151 |
| 01418 | 11468 | 17461 | 26835 | 33949 | 42031 | 49088 | 58016 | 65517 | 69225 |
| 01814 | 11916 | 17582 | 26886 | 34064 | 42215 | 49222 | 59736 | 65598 | 69556 |
| 02018 | 12550 | 17698 | 26998 | 34646 | 42523 | 50348 | 60042 | 65767 | 69906 |
| 02952 | 13238 | 17710 | 27502 | 34920 | 42802 | 50738 | 61319 | 65805 | 70003 |
| 03101 | 13631 | 18986 | 27568 | 35030 | 43587 | 50901 | 61637 | 65918 | 70284 |
| 03779 | 13773 | 20424 | 27887 | 35627 | 43664 | 53997 | 61816 | 66201 | 71526 |
| 04183 | 13952 | 20774 | 28023 | 35987 | 44047 | 54366 | 61925 | 66805 | 71879 |
| 05134 | 14774 | 21338 | 29067 | 36346 | 44105 | 54814 | 62384 | 66968 | 72398 |
| 05517 | 14809 | 22935 | 29375 | 36979 | 44264 | 55360 | 62838 | 67303 | 72717 |
| 05884 | 14980 | 23379 | 29619 | 39243 | 44580 | 55595 | 63227 | 67355 | 72897 |
| 06336 | 15536 | 23470 | 31236 | 40075 | 46803 | 55748 | 64002 | 67437 | 73689 |
| 07573 | 16026 | 23997 | 31990 | 40136 | 47016 | 56799 | 64281 | 68586 | 74521 |
| 07855 | 16661 | | | | | | | | |

Намеснік начальніка аддзела Дзяржаўных пазык (КАЗАКОЎ)

Начальнік сектара арганізацыі і правядзення тыражоў выйгрыша (ЗАЙЦАВА)

## *Вясна не застане знянацку*

Наша МТС узмоцнена рыхтуецца ва ўсеўзбраенні сустрэць веснавую сяўбу. Ужо да 10 лютага мы закончылі рамонт 35 трактароў і сцягваем з лясоў на сялібу МТС яшчэ 3 трактары, якія зараз знаходзяцца ў працэсе рамонта.

Побач з рамонтам трактарнага парка, мы актыўна ўзяліся за аднаўленне ўсёй гаспадаркі машынатрактарнай станцыі. Стварылі будаўнічую брыгаду, якая загатаўляе лесаматэрыялы для адбудовы канторы МТС і гаража.

Прыступілі да выпрацоўкі ўласнымі сіламі запраўначнага інвентара і інструментаў. Дапамагаем калгасам сваёй зоны ў рамонце сельгасінвентара. Ужо адрамантавана да дзесятка паракконных плугоў і 6 барон „зіг-заг“.

ДЗЕРАБІН,
дырэктар Чырвонаармейскай МТС.

# З РОЗНЫХ КРАІН

## Прэзідэнт Рузвельт аб аперацыях на Маршальскіх астравах

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што Рузвельт, каментыруючы аперацыі амерыканскіх сіл на Маршальскіх астравах і на востраве Трук, высока ацаніў узаемадзеянне арміі і флота ў гэтых аперацыях. Рузвельт сказаў, што ў аперацыях на Маршальскіх астравах амерыканскі флот не страціў ні аднаго карабля, і толькі ў ходзе аперацый ля вострава Трук адзін амерыканскі карабль быў, як відаць, тарпедыраван праціўнікам. Зараз гэты карабль накіраван на рамонт.

Рузвельт падкрэсліў, што амерыканцы патапілі вялікую колькасць японскіх барж, якія ў вялікай колькасці прымяняюцца японцамі для перавозкі грузаў з вострава на востраў.

## Ваенныя дзеянні ў Італіі

Галоўная стаўка войск саюзнікаў у Італіі паведамляе, што ў ноч на 23 лютага патрульныя караблі саюзнікаў адбілі спробу варожых быстраходных кацераў напасці на караблі, якія стаялі на якары ў парту Анцыо. Індыйскія часці англійскай 8-ай арміі і французскія часці амерыканскай 5-ай арміі адбілі атакі праціўніка. На астатніх участках фронта адзначаюцца толькі ажыўлёныя дзеянні патрулёў.

## Гібель двух японскіх гарнізонаў на Маршальскіх астравах

Як перадае агенцтва Домей Цусін, японскія войскі, пачынаючы з 30 студзеня, вялі цяжкія баі з буйнымі сіламі саюзнікаў, прадпрымаўшых атаку астравоў Квадзьелін і Луот (Маршальскія астравы). 1 лютага ў сувязі з высадкай войск саюзнікаў на гэтых астравах баі сталі яшчэ больш жорсткімі. У выніку гэтых баёў японскія войскі колькаснасцю ў 4500 чалавек загінулі.

Японскім гарнізонам на востраве Луот камандаваў контр-адмірал Ямада. Японскім гарнізонам на востраве Квадзьелін камандаваў контр адмірал Акіяма. Як указвае агенцтва, абодва гэтых адміралы загінулі.

За адказнага рэдактара М. РЫМАР.